А.Р. Агееу, дацэнт кафедры гісторыі культуры Беларусі МДУ імя А. Куляшова

# З ПРАКТЫКІ РАБОТЫ ЭТНАГРАФІЧНАГА ГУРТКА МАГІЛЕЎСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ПА ПАТРЫЯТЫЧНЫМ ВЫХАВАННІ МОЛАДЗІ

Ужо некалькі гадоу на гістарычным факультэце МДУ імя А.Куляшова існуе студэнцкі навукова-даследчы этнаграфічны гурток. Работа гуртка актывізавалася ў сувязі з прыняццем рашэння аб стварэнні ва ўніверсітэце вучэбнага этнаграфічнага музея. З мэтай назапашвання экспанатаў для экспазіцыі музея былі арганізаваны экспедыцыі ў Бялыніцкі, Дрыбінскі , Магілеўскі, Чавускі раены Магілеўскай вобласці . Сабраная



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

студэнтамі гістфака і філфака калекцыя рэчаў народнага побыту XIX-пач.XX ст.ст. дазволіла літаральна за год стварыць экспазіцыю і адкрыць музей. Фінансавую падтрымку музею аказала дзяржаўная гісторыка-культурная экспедыцыя па захаванні помнікаў гісторыі і культуры ў раенах, пацярпелых ад аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

Асноунымі задачамі гуртка першапачаткова з'яўляліся вучэбныя, навукова-даследчыя і прыкладныя (стварэнне музея ). Але адразу высветлілася, што праца гуртка мае вялікі выхаваўчы уплыў на студэнтаў. Экспедыцыі, экскурсіі , сустрэчы з краязнаўцамі , пашуковая и даследчая работы спрыялі патрыятычнаму выхаванню як ускосна, так і непасрэдна. Знаёмства з прыродай роднага краю, побытам жыхароў сучаснай беларускай вёскі і цяжкімі умовамі жыцця нашых продкаў (праз знаемства з старадаўнімі речамі і тэхналогіяй іх вырабу) спрыяла узнікненню любові да прыроды, да традыцый свайго народу. Яе выхаванне, на наш погляд, з'яуляецца адной з задач патрыятычнага выхавання.

З цягам часу стала зразумела, што работа гуртка з'яуляецца эфектыўнай формай ваенна-патрыятычнага выхавання. Студэнты, якія праводзілі этнаграфічныя даследаванні, пастаянна вялі размовы з жыхарамі вёсак пра Вялікую Айчынную вайну. Для высвятлення перспектыўнасці вёсак на этнаграфічны матэрыял, часу стварэння рэчаў, неабходна было ведаць, ці не паліліся вескі у гады вайны, ці не іх жыхары пад час блакадаў або з-за блізкасці фронту высяляліся і г.д. Такія размовы дапамаглі усталёўваць кантакт з тутэйшым насельніцтвам, спрыялі выкананню даследчых задач і непасрэдна знаёмілі студэнтаў з гісторыяй недауняга мінулага.

Таму ўжо да другой экспедыцыі была падрыхтавана анкета, якая утрымоўвала 21 пытанне аб рознабаковасці штодзеннага жыцця мірнага насельніцтва ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Апытваліся людзі сталага ўзросту, якім у тыя гады было не менш за 7 гадоў. Усяго было апытана каля 70-ці чалавек, і рабіць пэўныя вывады на такой колькасці рэспандэнтаў нельга. Тым больш, што не былі ахоплены розныя раены Магілеўскай вобласці. І тым не менш, на наш погляд, гэтая работа дала студэнтам магчымасць адчуць разнабаковасць поглядаў на падзеі, якія адбываліся ў гады Вялікай Айчыннай вайны ў Беларусі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова